ДУ “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г.Віцебска”
Цэнтральная гарадская бібліятэка
імя М.Горкага



# ПТУШКА КАХАННЯ І ЖАЛЮ

Літаратурны партрэт Яўгеніі Янішчыц

Складальнік: Карнілава Т.А.,
бібліятэкар цэнтральнай гарадской
бібліятэкі імя М.Горкага

Віцебск

***слайд 1*** Птушка кахання і жалю

***слайд 2*** (*гучыць музыка*)

Мне па душы глухія пушчы,
Лістоты замець на дварэ,
Я непрыручанаю птушкай
Жыву між сполахаў і дрэў.

Я. Янішчыц.

Гледзячы на гэты фатаздымак, міжволі робіцца невыносна балюча і тужліва. Як гэта было нядаўна. А між тым ужо мінула 25 гадоў з таго непапраўна-трагічнага дня, калі ў вышыню небыцця і бессмяроцця паляцела на крылах адна з самых слаўных птушак нашай нацыянальнай літаратуры - паэтэса Яугенія Янішчыц.

Сапраўды, Жэня сама была, як тая ластаўка, якая вылецела з гнязда сваей палескай хаты, акрыленая, узнеслая, даверлівая, ад таго і ранімая. Яна жыла ў тым палёце, "выдыхаючы ў неба радкі", не надта ўладкоўваючы свой быт, не думаючы пра пасады, званні ды ўзнагароды, што для многіх было вельмі істотна ў тым, ужо даволі далёкім часе. Яна жыла паэзіяй, высокай і натхненнай. Гэта ўдаецца нямногім паэтам - пісаць сэрцам.

Прыродны паэтычны дар і цяжкая жыццёвая дарога. Вялікая творчая ўдача, высокі лірычны ўзлет і глыбокая асабістая драма - жахлівы зыход. Паміж днём нараджэння і трагічнай датай - сорак гадоў, толькі сорак ...

***слайд 3***

Жыццё Я. Янішчыц пачалося на вясковым улонні. Нарадзілася паэтэса 20 лістапада 1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Бацька рана памер. Выхоўвалі яе маці, Марыя Андрэеўна, і айчым, Патапчук Іосіф Сцяпанавіч, якія працавалі ў калгасе.

Партрэт дзяўчынкі Жэні можна намаляваць яе ўласнымі вершамі:

Не воблака, а проста аблачынка
Загадкава плыве над галавой.
Смяюся я:
вяселая дзяўчынка
Як – матылек,
ляціць над кладкай той...
Як добра ей журыцца
беспрычынна.
Да твару ей і лета, і зіма...
Ўсміхнуся я:
яшчэ бяжыць дзяўчынка
Па кладцы той,
якой даўно няма.

Бяжыць, а насустрач ёй раскрывае абдымкі бясконцы,акрылены свет хараства, дабрыні, людскога даверу і спагады. Гэты свет ў грудзях дзяўчынкі смяецца, спявае, журыцца і кладзецца ў радкі вершаў. Яшчэ толькі смутна адчутых, толькі-толькі вымаўленых услых… І першай іх, вядома, пачуе маці.

***слайд 4***

Першыя вершы 16-гадовай вучаніцы Парэцкай сярэдняй школы Пінскага раёна з'явіліся ў друку ў 1964 годзе і звярнулі на сябе ўвагу чытачоў і крытыкаў шчырасцю, нязмушанасцю, натуральнасцю паэтычных уражанняў, уменнем гаварыць так, што прыватнае вырастала ў маналог пакалення (таго пакалення, якое ішло ў літаратуру ўслед за Р. Барадуліным, В. Іпатавай, А. Разанавым, А. Салтуком і іншымі.).

Першыя вершы Жэні Янішчыц, не Яўгеніі, а менавіта Жэні, былі свежыя, чыстыя, нейкія як бы прасветленыя, празрыстыя. Талент быў бясспрэчны. Так, па-юначы акрылена і радасна ступіла ў беларускую літаратуру Жэня Янішчыц.

... Была дзяўчынка, русая, з касой,
Спяшалася да школы на пагорку.
А ўжо ей шлях пракрэслілі слязой
І песняю наканавана зорка.
Усе дзяўчынка сэрцам прыняла,
Каб зразумець і блізкіх і далекіх,
Каб несці ў свет святло свайго сяла,
Каб стаць сястрой паэтам і пракам ...

З. Дудзюк-Зорка.

***слайд 5*** (*гучыць музыка*)

Першая кніжка "Снежныя грамніцы" выйшла з друку ў 1970 годзе. І ўжо не Жэні - Яўгеніі, студэнткі-выпускніцы ўніверсітэта. Кніжка ясная, свежая, росная, быццам тая раніца, з якой яна, Жэня Янішчыц, і выбегла (менавіта выбегла) у літаратуру. "Снежныя грамніцы" сталіся сапраўднымі грамніцамі ў паэтычным свеце Беларусі.

Я прыгадваю вескі дымныя -
Ні двара там і ні кала
Ты мяне, быццам маці,
Радзіма,
За руку ў далячынь павяла.
Мы ішлі ятугамі грэблямі,
Па калені ўгрузалі ў снег
Ля хацін датляваючых грэліся,
Наядаліся толькі ў сне.

У гэтых шчырых і непасрэдных радках ўсё ідзе хутчэй ад вычытанага ў кнігах Р.Барадуліна і П. Броўкі, чым ад жывых уражанняў, але яны сведчаць аб тым, што полымя адгрымеўшай вайны кідае адсвет на жыццёвы і творчы шлях гэтага пакалення, якое хоць "не глытала па акопах дыму", але і яго не песціў лёс.

Мы над горам схіляліся кожным,
Ратавалі ўсіх, як маглі
І ўставала эпоха трывожная
З-пад заўчасных, маўклівых магіл.

***слайд 6*** ( *гучыць музыка*)

Выток натхнення паэтэсы - ва ўсведамленні асабістай далучанасці да лёсу Радзімы, роднай зямлі, мовы, культуры народа, яго гісторыі і сучаснасці:

Чую тваю жаўруковую музыку
У скошаных травах мурожных.
Мова, як сонца мае беларускае,
Ты свецішся словам кожным.
Цябе і заворвалі і закопвалі,
І ўсе ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе,
Родную, цеплую, жывую і непаўторную.

Кніга "Снежныя грамніцы" засведчыла: "у беларускую паэзію прыйшла яркая, самабытная паэтэса з глыбокім нацыянальным мысленнем, з выразна акрэсленай, негледзячы на зусім юны ўзрост, грамадзянскай пазіцыяй. Талент Яўгеніі Янішчыц, нібы з глыбокай крыніцы, біў, струменіў у кожным яе радку, у кожным слове, кожнай страфе!"

мя паэтэсы атрымала пэўную вядомасць, а яе творы друкаваліся не толькі ў беларускіх газетах, часопісах і калектыўных зборніках, але і ва Ўкране, Расіі, у такіх цэнтральных выданнях, як "Маладая гвардыя", перакладаліся за мяжой.

Здавалася, лёс паэткі складваўся шчасліва. Пасля школы Жэня скончыла ўніверсітэт. У яе атрымаўся бліскучы дэбют, выйшаў зборнік вершаў "Снежныя грамніцы".

***слайд 7***

Потым было замужжа, пра якое пісала нават газета "Літаратура і мастацтва".

Муж - Сяргей Панізнік, таксама надзвычай яркі таленавіты паэт. Але ці можна жыць разам двум агням, двум агністым зоркам? Зорка жыве сама па сабе... Пасля нараджэння сына, пажыўшы некалькі год з мужам за мяжой у залатой Празе, Яўгенія Янішчыц вярнулася на радзіму.

***слайд 8***

Потым, як бы хто яе сурочыў. Пайшла паласа цяжкіх бедаў: дарожнае здарэнне, працяглае, пасля наезду машыны, лячэнне, развод, нечаканая трагічная смерць бацькі. І ад любові да жыцця не засталося і следу. Мабыць, такі стан называюць дэпрэсіяй.

Творчасць паэтэсы прыпала на складаныя і супярэчлівыя гады татальнага знішчэння грамадскіх ідэалаў, нацыянальных духоўных каштоўнасцей, калі звычайны чалавечы ўчынак успрымаўся і трактаваўся аднымі, як грамадзянская мужнасць – другімі, як сацыяльная крамола.

Вы не знойдзеце ў яе вершах і паэмах разгубленасці і няver'я. Яна верыла, што праўда, чалавечнасць, дабро, справядлівасць павінны перамагчы. Нават тады, калі ёй было невыносна цяжка, яна пісала:

Нібы ў часы раскосага Батыя
На сэрца словы пікай упадуць
Ярлык прыклеяць самыя святыя
І грэшныя - упасці не дадуць...
І змые час дурных здзіўленняў пену
І пачуцце абвугліцца датла.
... Паэзія - яна не знае тлену
Калі ў душы хоць прыгаршня святла.

Я. Янішчыц балюча адчувала дэфіцыт дабрыні, чуласці, спагадлівасці ў нашым грамадстве, дэвальвацыю культуры, падмену яе сурагатам. Аголенымі нервамі ўспрымала рэальнасць, калі пад пагрозай знішчэння апынуліся не толькі экалогія прыроды, але і экалогія самой душы чалавечай. І сваімі вершамі яна нібы гаварыла: "Людзі, спыніцеся, азірніцеся, задумайцеся! Ці ж можна дасягнуць шчасця ўсеагульнага, калі мы ў бяздумных парываннях наперад не заўважаем горкай слязы салдацкай удавы, засмучанага аблічча няшчаслівага дзіцяці?".

***слайд 9***

З дзіцячай наіўнасцю і мудрай сталасцю глядзела яна на свет. З высокай годнасцю і незалежнасцю гаварыла яна з палітыкамі і міністрамі, прывячала сірых і ўбогіх, таленавітых і няшчасных.

Другі зборнік "Дзень вечаровы" (1974) у 1978 годзе быў адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. У кнізе шырэюць далягляды, узбагачаецца вопыт, раскрываюцца новыя якасці лірычнага характару.

***слайд 10*** *(гучыць музыка)*

Вобразы роднага краю дапаўняюцца новымі рэаліямі: да асэнсавання Радзімы, Бацькаўшчыны, палескіх краявідаў, дружбы і кахання, сустрэчы з дарагімі людзьмі далучаецца пачуццё мацярынства з яго самаадданасцю:

Спі, мой сыне, спі мой болю,
Спі, крыло майго жыцця...

Я й сама цяпер с табою,
Як вяселае дзіця.
(У калыханку сыну.)

Сын - працяг жыцця і яго абнаўленне. Столькі пяшчоты, замілавання, мацярынскага шчасця ў паэтычным звароце да яго:

Свет мой - голенькі ды босы,
Мой бялюткі бацянок,
Засынаеш як дарослы,-
Пад галоўку кулачок.

***слайд 11*** *(гучыць музыка)*

Аднак не ўсе так злажана і проста ў яе жаночым лёсе. Жанчына нібы пераступае нябачную лёсам рысу, за якой - роспач, журба, трывога раставання:

Як проста ўсе як хораша было!
Між намі лета буйнае цвіло
Былі лугі і звонкія ільны
Ні роспачы,
Ні болі,
Ні віны...
Як добра ўсе
Як добра ўсе было!
Няўжо так хутка лета адцвіло?

***слайд 12***

Наогул лірыка Я. Янішчыц у асноўным аўтабіяграфічная.
Этапным паваротам прызнання крытыкі стаў зборнік вершаў "Ясельда" (1978). Больш прыкметнае ўзмацненне ўвагі да складанасцей жыцця, ускладненне светабачання паэтэсы, драматызацыя яе лірыкі - ўсе гэта сведчыць пра мастацкае ўзмужненне Я. Янішчыц.

Асаблівай пранізлівасцю аўтарскага пачуцця вызначаецца ў "Ясельдзе" лірыка кахання. Пяшчотная і надзвычай тонкая ў передачы інтымнага пачуцця любоўная лірыка нясе ў сабе больш, чым раней, гаркоты. Нярэдкія тут матывы болю, пакут, расчаравання ў каханым:

Ні на міг, ні на век - не твая.
Так і трэба, відаць, так і трэба.
Распрыгонена сцежка мая
Аж да самага хмарнага неба.
(Ні на міг, ні на век - не твая.)

Перахітрыць сябе і пераадолець каханне не ўдалося. Яно назаўжды пасялілася ў жаночым сэрцы, напаўняючы яго болем, узмацняючы безабароннасць, ранімасць.

Табе мой боль, табе - і больш нікому:
Я й перад смерцю вымаўлю: люблю.
(То цемны бор, то рэдзенькі лясочак.)

***слайд 13****(гучыць музыка*)

У далейшым вершы пра каханне, створаныя таленавітым натхненнем паэтэсы, складаюць адну з лепшых старонак беларускай інтымнай лірыкі.

Пра лірыку Я.Янішчыц вельмі цяжка гаварыць, бо кожны верш і кожны радок настолькі арганічна ўваходзяць у яе, што вылучыць нешта асноўнае, каб не парушыць цэласнасць паэтычнага ўспрымання, амаль не- магчыма. Гэта асабліва характэрна для сталага яе майстэрства ў кнігах "На беразе пляча" (1980г.) і "Пара любові і жалю"(1983).

***слайд 14***

"Пара любові і жалю"- радок, які не выпадкова быў вынесены на вокладку адной з яе кніг. Каханне ў творах Янішчыц вельмі не простае. Яно гарачае і неўтаймаванае, але больш "пакутнае і балючае, чым радаснае і шчаслівае". І ўсе ж, якое б яно не было, гэта пачуцце заўседы шчырае і чалавечнае. Няхай гэта каханне па сваей сутнасці хутчэй за ўсе драматычнае, мы верым у яго вялікую ачышчальную сілу, у гуманістычны і аптымістычны пачатак, бо ў любую эпоху, менавіта каханне, робіць чалавека больш прыгожым, чулым, далікатным у адносінах да іншых.

Каго можа не крануць вось гэта гранічна адкрытае і шчырае прызнанне:

... Хачу цябе здаля
Трымаць навідавоку
Не набліжайся, не
Заручаны з другою,
Цяпер ты для мяне
З журбы і неспакою.

Колькі у гэтых радках не проста журбы і тугі, душэўнага болю, якога не развеяць і не адагнаць звычайнай развагай, якой бы мудрай яна ні была. У такіх выпадках не можа быць ніякага суцяшэння. Хіба апрача толькі ўсведамленнасці ці хутчэй за ўсе здагадкі пра тое, што ей выпала на долю і чаго яна не можа пазбавіцца.

Відаць, ад болю, ад жалейкі
Было з'явіцца мне на свет.

Жалейка, жаль, жаласнасць, свет і святло - за гэтымі словамі стаіць пэўны сэнс і значэнне, а значыць нясуць яны і пэўную мастацкую нагрузку. І хоць каханне скончылася разрывам, у творах няма і намёку на песімізм і расчараванне. Час ад часу гераіня пытаецца:

Ці ўспомніцца, ці ўспомніцца

Рака і жоўты плес?
Мяне, нібы палонніцу,
Ты цераз кладку нес?

***слайд 15***

Стан яе душы выяўляецца праз узаемазалежнасць такіх эмацыянальных катэгорый, як любоў і боль, шчасце і адчай, радасць і журба, святло і цемра, якія найбольш паўтараюцца. У многіх вершах паэтэсы - аглядка на няроўную, не надта ласкавую жаночую долю і шчасце, аналізуецца жыццёвы шлях:

Сухі і маланкай апалены ствол,
А ў чым даўгалецця прычына?
Не трэба кахаць мяне за рамяство.
Перш- наперш, я проста жанчына.
Магчыма, мне выпала меней,
Чым той,
Якую заслоняць плячыма.
Ды ў кожнай смяшынцы і ў слезцы любой
Перш-наперш, я толькі жанчына.
Прашу. І не ўмею высока прасіць,
Тым болей выпрошваць пяшчоты.
Як цяжка мне гордую голаў насіць,
У горкім сутонні самоты.
Віной мне - разлука. І жарты - віной,
Віною - журба пад вачыма.
Мужчынская лірыка... А ці не ў ей,
Як чайка, крыляе жанчына?
("Сухі і маланкай апалены ствол")

Лёс не пашкадаваў Я. Янішчыц ні вядомасці, ні гучнай славы, ні сустрэч, ні дарог. Падаравала доля і каханне. Праўда, гэтак жа, як шчодра сыпала з поўнага прыполу, так і адбірала па ветру.

***слайд 16***

Жывучы ў Мінску, Я. Янішчыц, ніколі не парывала з роднай зямлёю, заўседы вярталася думкамі і паэтычнымі радкамі ў палескі край, перажываючы, асэнсоўваючы нялёгкі, а часта і трагічны лёс простых, звычайных і, разам з тым, вялікіх сваёй працавітасцю, душэўным багаццем людзей. Я. Янішчыц дарыла ім сваёй паэзіяй чысціню, адкрытасць, шчырасць. Менавіта вёска становіцца для паэтэсы крытэрыем усіх жыццёвых каштоўнасцей. Палеская зямля дала ёй сілу.

"Я вас, люблю" - няма каму сказаць!
А мне ў любві да скону не змыліцца.
Я вас люблю, лясы і сенажаць,

Старая веска, новая сталіца...
("Я вас люблю")

***слайд 17***

Я. Янішчыц імкнулася ў жыцці да ўсіх магчымых вышынь у самарэалізацыі. Аднак шлях да іх выдаваўся часцей цярністым, няроўным. Жыццёвыя выпрабаванні патрабавалі выключнай цярплівасці і поўнай аддачы. Супярэчнасці быцця праламляліся ў яе душэўным стане, балюча ранілі мяккую жаночую існасць. І гэта не магло не паўплываць на з'яўленне ўнутранай нестабільнасці. І як трапна пісала сама Яўгенія Янішчыц:

І за што б вы мяне не судзілі –
Трудны шлях мой і боль не знарок.

Дзіву даешся, які цяжар пачуццяў, настрою, энэргіі змяшчала ў сабе яе кволае сэрца, але ніколі ў ім не было зняверанасці і помсты. Была безабароненасць перад жорсткасцю і хамствам. Гэты гнёт, які непрыкметна падточваў жыццёвыя сілы, не прайшоў бясследна.

Апошняй прыжыццёвай кнігай Яўгеніі Янішчыц стала "Каліна зімы"(1987) Невыпадкова паэтэса выбрала такую назву.

***слайд 18***

Вобраз каліны - адзін з самых любімых ў беларусаў. Каліна заўседы асацыіруецца з матуляй, Радзімай.

Жэня балюча перажывала тое, што Беларусь ніяк не можа выйсці на шлях паўнапраўнага нацыянальнага творцы. Яе прыгняталі абыякавыя і нават пагардлівыя адносіны да роднай мовы, культуры, мудрых народных традыцый.

Нават асабістае, інтымнае набывае у гарачым пачуцці да каханага ўсеагульначалавечы сэнс і сутнасць:

Я так цябе кахала, што ў каліне
Адбілася ўся мая душа!

"Калінавым і жытнім спелым шляхам
Самой прыроды слаліся радкі" :
... Ой жа зімой закіпае каліна,
Гронка яе - як надзея жыцця.

***слайд 19***

Сваей паэзіяй яна хоча дапамагчы людзям адоліць рабскую псіхалогію, набыць упэўненасць у сваім вялікім прызначэнні, абудзіць жаданне зрабіць гэты грэшны і няўстойлівы свет больш чыстым, добрым і светлым.

***слайд 20***

У 1988 годзе выйшла ў свет кніга выбранай паэзіі Яўгеніі Янішчыц "У шуме жытняга святла". У кнізе сабрана лепшае з напісанага за дваццаць гадоў

літаратурнай працы. Ва ўсей яе паэзіі адчуваецца моцная злітнасць з родным краем, з усім тым, сярод чаго яна расла і сталела. Глыбокім і шчырым пачуццем прасякнуты вершы землякам: жанчынам, мужчынам, дзядулям і бабулям. Нездарма паэтэса ўсклiквае: "З вамі разам, землякі, і ў зямлі не боязна!" І наогул паэтэса верыла:

"І пакуль дыхае планета
Не вынішчыцца да тла
Душа людзей і паэта
У шуме жытняга святла.

***слайд 21***

Я. Янішчыц вылучаецца сваей душэўнай шчодрасцю, празмернай ранімасцю і, нарэшце, непрыстасаванасцю мяккай жаночай душы да нашых суровых рэалій, трывогай і неспакоем за нашу будучыню. З аднаго боку натура гордая, шчырая, адкрытая, якая рвецца да святла, цяпла, не прымаючы антыграмадскія праявы. З другога ж, натыкаючыся на чэрствасць, абыякавасць, душа разрываецца ад болю і смутку.

Усякая зорка згарае, каб сусвету пасылаць святло. Зорка Яўгеніі Янішчыц згарала вельмі інтэнсіўна.

І раптам - абрыў, трагічная смерць!

25 лістапада 1988 года, праз пяць дзен пасля афіцыйна яшчэ не юбілейнай, але ўсе ж круглай даты свайго 40-годдзя паэтэса скінулася з балкона новай, зусім нядаўна атрыманай кватэры на восьмым паверсе. Жахлівы, няшчасны выпадак? Магчыма. А найбольш верагодна - самагубства. Чаму ж адбылася трагедыя?

Калі ўважліва перачытаць вершы паэткі, то можна ўлавіць пэўныя прадчуванні наканаванасці і фатальнай непазбежнасці:

...Пакуль яшчэ не выспела за 40 - мне молода. Астатняе - затым" - выказвалася яна ў вершы "Вось мой паром", дзе пэўная ўзроставая мяжа набыла магчымы сэнс.

***слайд 22*** *(гучыць музыка)*

Свой сямейны крах, неўладкаванасць Яўгенія Янішчыц успрымала надзвычай востра. Пра гэта сведчаць яе вершы, перш за ўсе інтымная лірыка, у якой зусім не выпадкова так часта з балючай пранізлівасцю гучалі матывы нешчаслівага кахання. Не менш красамоўныя ў гэтым сэнсе і прамыя прызнанні ў лістах да сяброў. Вось адно з іх:

«Вельмі балюча і пакутліва, паглядзіш навокал на шчаслівыя пары і думаеш: "За што ты Богам пракляты, ці ты горш за ўсіх! Жанчына ўсе ж створана для сямейнага шчасця ў першую чаргу".

Палеская летуценнiца імкнулася быць гранічна шчырай і сумленнай ва ўсім. Урэшце не вытрымала, надламалася і, хутчэй за ўсе, сама склала свае "стомленае крылле". На жорсткіх скразняках бесчалавечнай эпохі першымі гінуць

летуценнікі з чулай душой і трапяткім сэрцам. Таму загінула і Яўгенія Янішчыц. Але яна пакінула нам сваю цудоўную паэзію, якой суджана доўгае жыцце - пакуль будуць беларусы, пакуль будзе жыць беларускае слова.

Рыгор Барадулін ў вершы "Яшчэ адно прызнанне Палессю" пісаў: "Зоры, як вершы Жэні Янішчыц, - з суму і са святла". Падобная адзнака - гонар для творчай асобы і ставіцца яна далека не кожнаму.

Шмат пісьменнікаў і паэтаў адгукнуліся на трагічную смерць Я. Янішчыц з глубокім болем і смуткам.

***слайд 23***

Вячаслаў Машко "Жэні Янішчыц"

Трагічна спынена жыцце...
Змоўк крыштальна чысты голас.
Нібы зламаны бурай колас,
Ты адышла ў небыцце...
Здаецца, час змяніў свой ход ...
Так сумна стала навакола,
Па-восеньску няўтульна, гола,
Як і ў той шчымлівы год.
Зграбае вецер зноў лісты ...
Жалобы не спадае хваля.
О, Беларусь, як часта ты
Заўчасна таленты хавала!

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Бугаёў, Д. Я. Чалавечнасць /Д.Я. Бугаёў. –Мн.:Маст. літ., 1984.-С.
2. Бугаёў, Д. Я. Арганічнасць таленту: літаратурна-крытычныя артыкулы /Д.Я. Бугаёў. – Мн.: Мачт. Літ., 1989. – С.
3. Калядка, С. У. Непрыручаная птушка палесся /С. У. Калядка. – Мн. Беларус. Навука,2007. – 216с.
4. Аўсяннікава, Т. Абнадзеяныя дні:[ пра творчасць Я. Янішчыц] / Тамара Аўсяннікава // Маладосць. -2011. - №3. – С.133 - 136
5. Аўсяннікава, Т. “Боль які? Якога болю эра?”: старонкі жыцця і творчасці Я. Янішчыц/ Тамара Аўсяннікава //Род. слова. – 2008.- №11. – С. 13 - 14
6. Жук, А. Як высока ты цяпер жывеш: да 60-годзя Я. Янішчыц / алесь Жук // Маладосць. – 2008. - №11. – С. 103 – 105
7. Калядка С. Краю блаславённая дачка: [пра Я.Янішчыц] / Святлана Калядка // ЛіМ. – 2013. – 22 лістап. (46). – С. 6
8. Калядка, С. шчымлівая песня непрыручанай птушкі: творчасць Яўгеніі Янішчыц / Святлана Калядка // Род. слова , - 2008. - №11. – С. 10 – 12
9. Катляроў, І. Жыцця загадкавы палет: да 65-годдзя Я. Янішчыц / Ізяслаў Катляроў // ЛіМ. – 2013. – 22 лістап. (46). – С. 6

10. Нуждзіна, Т. “Тчэцца памяці ніткай суравой…”: да 60-годдзя Я. Янішчыц / Тамара Нуждіна // Маладосць. – 2008. - №11. – С. 97 – 102
Панізнік, С. Наўздагон…: да 60-годдзя Я. Янішчыц / Сяргей Панізнік // Маладосць. – 2008. - №11. – С. 107 - 108